«Зацвярджаю»
Прарэктар па выхаваўчай
і сацыяльнай працы
_______ Т.В. Сакалова
«__» ______ 2016 г.

«Зацвярджаю»
Дэкан філалагічнага
факультэта
_______ В.А. Фелькіна
«__» ______ 2016 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ БРЭЙН-РЫНГУ «ЖУРНАЛІСТЫКА Ў 2016 ГОДЗЕ»

Брэйн-рынг «Журналістыка ў 2016 годзе» праводзіцца згодна з планам працы БрДУ імя А.С. Пушкіна ў межах Тыдня ўніверсітэта і з'яўляецца **адкрытым**, у ім могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, вучні агульнаадукацыйных устаноў Брэсцкай вобласці (па запрашэнні аргкамітэта).

**Мэты і задачы** брэйн-рынгу – актуалізаваць цікавасць моладзі (вучняў і студэнтаў) да журналістыкі як прафесіі і як вобласці літаратурнай дзейнасці.

**Арганізатарамі** адкрытага брэйн-рынгу «Журналістыка ў 2016 годзе» з'яўляецца кафедра журналістыкі філалагічнага факультэта Установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна».

**Аргкамітэт** брэйн-рынгу:

1. Скібіцкая Л.В. – загадчык кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
2. Клундук С.С. – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Дзябёлая А.В. – старшы выкладчык кафедры журналістыкі.

**Умовы правядзення брэйн-рынгу**

Для ўдзелу ў брэйн-рынгу **да 24 кастрычніка 2016 года** неабходна даслаць **заяўку** на электронны адрас кафедры журналістыкі (e-mail: kafjurn@brsu.brest.by), якая ўтрымлівае ўсе неабходныя звесткі пра ўдзельніка (прозвішча, імя, імя па бацьку; навучальная ўстанова, факультэт, група, клас; кантактны тэлефон) (форма заяўкі прыкладваецца). Кожны факультэт БрДУ імя А.С. Пушкіна можа прадставіць аднаго ўдзельніка; кожная агульнаадукацыйная ўстанова Брэсцкай вобласці (школа, ліцэй, гімназія) можа прадставіць 2 удзельнікі. Каманды гульні фарміруюцца падчас правядзення брэйн-рынгу (26 кастрычніка 2016 года).

Брэйн-рынг праводзіцца **26 кастрычніка 2016 года** на базе БрДУ імя А.С. Пушкіна (аўд. 328 вучэбнага корпуса № 2, вул. Міцкевіча, 28):

- рэгістрацыя ўдзельнікаў – з 14.30 да 14.50 (аўд. 328);
- пачатак брэйн-рынгу – а 15.00 гадзіне;
- узнагароджванне – 16.30.

**Командзіровачныя выдаткі** для ўдзельнікаў брэйн-рынгу – за кошт камандзіруючых арганізацый.

**Падвядзенне вынікаў брэйн-рынгу**

Ацэньвае працу каманд гульні і падводзіць агульныя вынікі **журы.** Каманда пераможцаў узнагароджваецца дыпломамі БрДУ і сувенірамі.

**Кантактныя тэлефоны:**

+ 8 (016) 21 63 50 – кафедра журналістыкі;

+ 375 29 724 30 85 – Клундук Святлана Сяргееўна – дацэнт кафедры журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.